## Покліч сівога Дняпра

Пісаць прозу Ўладзімір Дуктаў пачаў яшчэ ў школьныя гады, і аказалася, што гэта не проста нейкая выпадковасць. Родам з горада Крычава, які раскінуўся на правым беразе Сожа, з пяром ён не расставаўся ні ў студэнцкія часы, калі вучыўся Белдзяржаўніверсітэце, ні тады, калі працаваў журналістам. На сённяшні дзень малады празаік з’яўляецца аўтарам кнігі апавяданняў «Дзякуй і даруй», выдадзенай у папулярнай серыі «Бібілтэка часопіса «Маладосць». Кніга цёпла сустрэта чытачамі, высока ацэнена крытыкай, у прыватнасці у штотыднёвіку «Літаратура і мастацтва», за гэты зборнік Уладзімір Дуктаў прыняты ў Саюз пісьменнікаў Беларусі, а не так даўно ён узначаліў пісьменніцкую сябрыну Магілёўскай вобласці.

Ёсць у маладога аўтара характэрнае для яго творчасці апавяданне «Сшытак», якое можна ацэньваць як даволі ўдалую спробу па-мастацку расказаць пра пачатак сваёй літаратурнай працы «Напэўна, у кожнага дарослага чалавека захоўваецца нейкая рэч яго дзяцінства, - чытаем мы. – Для мяне такой рэліквіяй стаў агульны вучнёўскі сшытак... У маіх сачыненнях настаўнікі адкапалі літаратурныя здольнасці. Параілі больш чытаць, спрабаваць нешта пісаць. Чытаў я запоем. Узяўся нарэшце за пяро». Трэба сказаць шчыра: узяўся ў шчаслівы час, з лёгкай рукі школьных, а пасля і універсітэцкіх выкладчыкаў беларускай мовы і літаратуры.

Уладзімір Дуктаў, здаецца, мае ўсе здольнасці і задаткі, каб, выбраўшыся на шырокі літаратурны шлях, стаць у далейшым вядомым беларускім празаікам. Па-першае, ён уважлівы да трапнага слова і ёмкай дэталі, па-другое, усе яго творы прасякнуты дабрынёй і надзеяй, спагадай і любоўю да чалавека. Звычайна апавяданні У. Дуктава невялікія па аб’ёму, у нечым нават традыцыйныя, але яму ніяк нельга адмовіць ні ў выбары свежых тэм і незацёртых сюжэтаў, ні ў своеасаблівым бачанні свету. Пра гэта, у прыватнасці, сведчыць і яго новая кніга прозы «Трэцяя асоба». У ёй аўтар паказвае нялёгкія шляхі станаўлення характараў, востра ставіць і вырашае маральна-этычныя праблемы сучаснасці.

Так, у апавяданні «Легкавушка для сына» стары селянін і былы франтавік Восіп Кузьміч прыехаў у горад, каб па льготнай чарзе купіць «Жыгулі» новай мадэлі свайму даросламу нашчадку, стаматолагу па прафесіі. Легкавушку яны набылі, але Восіпу Кузьмічу не спадабалася, як жыве сын: падрабляе на машыне па начах, мала бывае ў сям’і. Было ў ім нешта, чаго ён, бацька, не здольны прыняць, апраўдаць. І пажылы чалавек, які прайшоў вайну і за доўгія гады жыцця не страціў сумлення, уцякае з сынавага дому. Сваёй злабадзённасцю вызначаюцца таксама апавяданні «Мёртвы якар», «Дачнік», «Сутарэнне», «Трэцяя асоба» і «Радоўка». Проза

малодога аўтара перасыпана крупінкамі трапнага гумара, у ёй шмат замалёвак прыроды, цікавых бытавых сцэнак, аб чым, напрыклад, сведчыць апавяданне «Граната».

Творы Уладзіміра Дуктава, сабраныя ў кнізе «Трэцяя асоба», як правіла вострыя і сучасныя. Галоўнымі героямі большасці з іх з’яўляюцца сённяшнія хлопцы і дзяўчаты, але знайшлося ў зборніку месца і для пажылых людзей, якія немала зведалі і пабачылі на сваім вяку. У многіх апавяданнях выразна чуецца рэха вайны («Саперніцы», «Бабылка»), водгуле Афганістана і Чарнобыля («Няшчасны выпадак», «Жыла-была Пёкла», «На рыбалцы»). Аднак, як бы цяжка ні даводзілася героям У. Дуктава, амаль усе яны летуценнікі і рамантыкі, з вялікім запасам трываласці, жыццёвай мудрасці і веры у чалавечую шчырасць і дабрыню. Яны пераадольваюць нягоды і зрызоты лёсу і, маючы высокія якасці, імкнуцца зрабіць жыццё прыгожым, па-сапраўднаму вартым захаплення і пераймання.

Тэмы і сюжэты для змястоўнай прозы малады празаік, зразумела, бярэ ў родным Прыдняпроўі, чэрпае натхненне на берагах Сожа, у самабытных магілёўскіх вёсках. З кожным новым творам аўтар усё больш паглыбляецца ў жыццё, на значна лепшым узроўні, чым раней, вырашае праблемы чалавечага існавання. Сівы Дняпро паклікаў Уладзіміра Дуктава да пяра ў шчаслівы час, і вельмі прыемна, што кнігай «Трэцяя асоба» ён, цікавы літаратар, набраў добры разгон і тым самым засведчыў сваю сталасць і таленавітасць.

*Віктар Гардзей,*
*лаўрэат Літаратурнай прэміі імя*
*Івана Мележа.*